ВЕСЦІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР № 3 1989
СЕРЫЯ ГРАМАДСКІХ НАВУК

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*А. М. МАКАРЭВІЧ*

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ АДЛЮСТРАВАННЯ РЭЧАІСНАСЦІ 20-х ГАДОЎ У АПАВЯДАННЯХ ЦІШКІ ГАРТНАГА

У апавяданнях Ц. Гартнага 20-х гадоў прыкметны філасофскі падыход аўтара да жыцця, яго праблем, мастацкага іх адлюстравання. Ён характарызуецца глыбокім усведамленнем супярэчнасцей рэчаіснасці, канфліктаў як паміж асобнымі людзьмі, так і ў самім чалавеку. Аналіз творчасці пісьменніка дае падставы сцвярджаць, што яго літаратурная спадчына ў жанры апавядання набывае характар адлюстравання жыцця ў новых гістарычных умовах і яго філасофскага асэнсавання.

У апавяданні «Трэскі на хвалях» (1923) Ц. Гартны паказаў розны падыход інтэлігенцыі да справы рэвалюцыйнага пераўтварэння грамадства, ён ставіў і пэўным чынам вырашаў праблемы беларусізацыі, захавання і развіцця дэмакратыі ў рабоце Саветаў.

Маладыя настаўнікі, героі апавядання, не прымаюць змены, што адбываюцца ў Вікурах, хоць ніхто з іх не страціў ніякай уласнасці ў выніку рэвалюцыі, яны не належалі да маёмасных колаў; не было, значыць, асновы для класавай варожасці да Савецкай улады. Аднак Мірон Бізун, Паўлюк помсцяць новай уладзе за расчараванні, за разбурэнне іх славалюбівых планаў адносна будучага «салодкага» жыцця, на шлях да якога яны толькі-толькі пачалі да рэвалюцыі станавіцца. Імі кіравала прага ўлады, якая дала б перавагу над астатнімі. «Вікуры не мелі месца ў іх жыцці. Пецярбург — вось дзе луналі іх думкі... Яны лічылі сябе вялікімі людзьмі, перад якімі ўсіх бы вікурцаў спадалі шапкі» [1].

У апавяданні «Трэскі на хвалях» ёсць цікавы вобраз саматканай світкі як увасабленне беларусаў-інтэлігентаў — выхадцаў з народнага сялянскага асяроддзя. Аналіз характараў дзеючых асоб гэтага апавядання з улікам грамадскага жыцця Беларусі прыводзіць да вываду, што праблема «саматканай світкі» была не толькі ў дарэвалюцыйным мінулым, як адзначаў пазней сам Ц. Гартны, аналізуючы творчасць М. Чарота [2], але і ў першыя паслякастрычніцкія гады. Пісьменнік паказаў гэта шляхам сутыкнення характараў персанажаў твора.

«Нас выхоўвалі на буржуазнай маралі — таму і атруцілі нам ясны сэнс жыцця... Сапраўды — ці ж мы не з таго дрэва, якое цяпер разраслося і пакрыла ўвесь край? Кроў у нас — кроў быўшых рабоў, але атручаная зменаю да іх...» — гаворыць настаўнік Плаха (131).

Даючы адпаведнае тлумачэнне касмапалітызму, жаданню ўлады, асуджаючы пагардлівыя адносіны некаторай часткі беларускай інтэлігенцыі да ўсяго роднага, аўтар заклікае да ўсведамлення і асэнсавання новых з'яў жыцця, сваёй нацыянальнай годнасці, на прыкладзе дзейнасці Андрэя Камеля і настаўніка Плахі паказвае перспектыўнасць такіх прагрэсіўных змен.

«Нас пакалечылі змалку так моцна, што ажно і цяпер не апамятацца, не выраўняцца... Скалечылі нашу душу, зглумілі нашу самотнасць. Не дзіва, што кожная рэч, блізкая і зразумелая нам,— цяпер не да

[1] Гартны Ц. Насустрач сонцу: Выбраныя апавяданні. Мінск, 1978. С. 124. (Далей спасылкі даюцца на гэта выданне з указаннем старонкі).
[2] Жылуновіч З. Рэвалюцыйным шляхам // Полымя. 1928. № 4. С. 181.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спадобы. Трэба лячыцца, трэба лячыцца, а то без пары загінем...» — робіць вывад Плаха (133).

Іменна прадстаўнік «світкі», Габрусь, даволі хутка пераканаўся, што самы надзейны сродак набыцця ведаў працоўнымі масамі Беларусі — родная мова. «Нашаму селяніну,— гаворыць ён,— патрэбна даставаць адукацыю самым лёгкім парадкам, а гэты парадак ёсць яго мова. Не можна пераскокваць там, дзе ёсць магчымасць перайсці...» (133).

У апавяданні «Трэскі на хвалях» знаходзіць мастацкае пацвярджэнне ленінскае палажэнне аб тым, што сутнасць сацыялістычнай дзяржавы — у самакіраванні праз народ. Аб гэтым сведчыць спрэчка ў валасным выканкоме па праблеме беларусізацыі школ рэспублікі. Паколькі старшыня выканкома Сліва нясе адказнасць за работу сваёй установы, ён імкнецца як мага хутчэй станоўча вырашыць гэту праблему ў інтарэсах народа, ад імя якога кіруе. Але ў Слівы і Андрэя Камеля няма яшчэ пэўнай паслядоўнасці ў вырашэнні такой праблемы, яны часам занадта прамалінейныя, катэгарычныя і нецярпімыя ў сваёй дзейнасці.

«— Так быць не павінна,— начальніцкім голасам казаў прадсядацель іспалкома... Можа, і сама рэвалюцыя многім з вас не падабаецца, дык будзеце ўпірацца супроць яе?» (142).

«— Усё, што вам падносіць Савецкая ўлада,— то ёсць ад рэвалюцыі,— дадаў Андрэй,— і супроціў яго змагацца — то змагацца супроціў працоўнага народа. Іначай судзіць нельга... Ваш ухіл ад прыказаў Наркамасветы — гэта контррэвалюцыя...» (143).

Кіраўнікі валвыканкома, Сліва і Камель, разумеюць правільнасць прапанаванай ім ідэі беларусізацыі школ, неабходнасць яе правядзення, але дырэктыўны спосаб кіравання, які з-за аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын яны выбіраюць, нараджае бюракратызм, што несумяшчальны з дэмакратызмам.

У. І. Ленін адзначаў: «Змагацца з бюракратызмам да поўнай перамогі над ім можна толькі тады, калі ўсё насельніцтва будзе ўдзельнічаць у кіраванні... але да гэтага часу мы не дасягнулі таго, каб працоўныя масы маглі ўдзельнічаць у кіраванні,— акрамя закону, ёсць яшчэ культурны ўзровень, які ніякаму закону не падпарадкуеш. Гэты нізкі культурны ўзровень робіць тое, што Саветы, якія па сваёй праграме павінны быць органамі кіравання *праз працоўных,* на самай справе з'яўляюцца органамі кіравання *для працоўных* праз перадавы слой пралетарыяту, але не праз працоўныя масы» [3].

У апавяданні «Чырвонаармеец Панкел Ліпа» (1920) адлюстравана барацьба эгаістычнага і грамадскага, агульнанароднага ў адной асобе. У складанасцях гэтай барацьбы перамагае апошняе, калі асоба падымаецца да ўсведамлення сваёй адказнасці перад грамадствам, перад народам — такі ідэйны змест твора.

Вядома, што ў аснове любога развіцця, руху ляжыць барацьба супярэчнасцей. Гэта адносіцца і да свядомасці, мыслення індывіда. Не можа адбывацца прагрэс думкі без барацьбы пэўных супярэчнасцей; такое ж можна сказаць і аб маральным прагрэсе, які немагчымы без барацьбы маральных супрацьлегласцей (нават калі гутарка ідзе пра адносную маральную гармонію).

Аналіз эвалюцыі канфлікту ў свядомасці Панкела Ліпы, з аднаго боку, і канфлікту паміж Ліпай і Провам — з другога, дае падставы гаварыць, што мастацкае вырашэнне пісьменнікам узнікшых пытанняў трымаецца на філасофскім падыходзе да праблемы: чалавек у віхуры супярэчлівых імкненняў, што выклікае глыбокія псіхалагічныя перажыванні.

У творы назіраюцца два тыпы супярэчнасцей. Першы — унутраныя, сканцэнтраваныя ў свядомасці аднаго чалавека, Панкела Ліпы: паміж

[3] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 38. С. 170.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

эгаістычнымі імкненнямі і ацэнкай магчымай здрады; паміж агітацыйным і ацэначным; паміж жаданнем дэзерціраваць і немагчымасцю гэта зрабіць; паміж эгаістычным «я» і грамадскім «мы»; паміж імкненнем знайсці ў дзянікінцаў выратаванне ад абрыдлай службы і разуменнем, што яны — ворагі, ад якіх, чуў Панкел, нічога добрага не варта чакаць; паміж бачаннем у вайне толькі асабістых страт і разуменнем, што чырвонае войска абараняе ўладу працоўных і сялян.

Панкел не можа вызначыць устойлівую лінію паводзін да той пары, пакуль не ўсвядоміць сацыяльную ацэнку, значэнне і выніковасць свайго будучага магчымага злачынства. Ён адразу яшчэ не асэнсоўвае маральны бок прапанаванай Провам здрады. Адбываецца барацьба думак, сэнс якіх у тым, што пераход да ворага — своеасаблівае збаўленне ад службы, аднак гэта цяжка, немагчыма здзейсніць. Сярод рада вывадаў нараджаецца яшчэ адзін, які выключае першыя: «Н-не-е, ведаеце, цяжка і... страшна здавацца ў палон. Ды і брыдка, непачэсна-а... Гэта правакатарства, здрада. Усе будуць пальцам тыкаць: «Здраднікі, прадаўцы», скажуць» (65).

Але гэты вывад яшчэ не грунтуецца на глыбокай маральнай перакананасці героя ў ацэнцы сваёй будучай здрады: вынікі яе ён ацэньвае не з пазіцыі асабістых перакананняў, а з пазіцыі «што пра гэта скажуць людзі». Паступова яго пазітыўныя ацэнкі набываюць характар уласнай непахіснасці, якая трымаецца на асэнсаванні рэчаіснасці і ўсведамленні свайго месца ў ёй. І вось вынік барацьбы ўнутраных супярэчнасцей: Панкел «раптам пачуў настойны і выразны, ужо знаёмы яму нутраны голас: «Не хадзі... Цябе паслаў рабочы і селянін бараніць іх уладу, заваёваную дарагою цаною крыві і жыцця сотень слаўных ваякаў. А ты... ты памагаеш знайсці іх смерць, абрыдную, здрадніцкую смерць... Зазірні глыбей у сваю душу, ці вяліць яна табе, ці дазваляе гэта? Чужымі думкамі жывеш, ліхім манам верыш...

— Я не пайду, я не згаджуся на здраду! — рашуча ўголас адказаў сам сабе Панкел» (90).

Супярэчнасці знешняга характару — гэта супярэчнасці паміж Панкелам і Провам: Панкел і Проў — прадстаўнікі розных сацыяльных колаў; у іх неаднолькавыя мэтавыя адносіны аднаго да другога; чым далей Проў вядзе агітацыю, тым больш сумненняў яна выклікае ў Панкела; Проў апанаваны думкай аб пераходзе ў варожы лагер, Панкел жа асцярожны, жадае абдумаць усё, узважыць; Проў імкнецца дасягнуць мэты любой цаной, нават шляхам гібелі перабежчыкаў, Панкел жа хоча вярнуцца дамоў; адносіны Прова да ўлады бальшавікоў як да глыбока варожай, у Панкела — разуменне неабходнасці гэтай улады для людзей працы.

Унутраныя і знешнія супярэчнасці пераплятаюцца паміж сабой і падводзяць Панкела да адзіна правільнай думкі, якая запатрабавала ад яго рашучых дзеянняў, што каштавалі герою вельмі дорага — ён загінуў ад рукі здрадніка Прова. І смерць яго ўспрымаецца як перамога сапраўды гуманнага пачатку ў душы простага чалавека.

У беларускім апавяданні 20-х гадоў назіраецца пэўная цікавасць аўтараў да фактаў здрадніцтва і асэнсавання яго вытокаў у перыяд грамадзянскай вайны. Галоўную прычыну гэтай з'явы пісьменнікі бачаць у маральнай дэградацыі тых, хто стаў на шлях здрады, у няўстойлівасці іх ідэйных перакананняў, іншы раз — у іх адсутнасці.

У апавяданні «Бегунец» (1920) Ц. Гартны не акрэслівае выразна сацыяльна-матэрыяльнае становішча сям'і Доўбняў. І дэзерцірства Франуся Доўбні не столькі адлюстраванне саміх фактаў уцёкаў з войска, колькі, думаецца, мастацкі падыход да далейшага разважання, чаму можа адбывацца такое злачынства.

Белетрыстычнае апавяданне выяўляецца тут праз паказ кантрастаў паміж партрэтнымі характарыстыкамі персанажаў і іх дзеяннямі, пры дапамозе мастацкай дэталі-малюнка. У непрацяглай дынаміцы дзеяння

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шляхам акцэнтавання ўвагі на здавалася б нязначных дэталях, учынках раскрываецца псіхалогія герояў, іх жыццёвае крэда: адседзецца ў зацішку, перачакаць ваеннае ліхалецце, а ваююць хай другія. Францусь Доўбня, апынуўшыся пасля ўцёкаў з чырвонага войска ў бацькавай хаце, расказваў пра свае прыгоды: «Цішэй вы троха,— пераняў Платон (брат Франуся.— *А. М.*), не паднімаючыся з лавы,— можа, у двары хто слухае...» (105); «Брат не падымаўся з лавы, дзе спаў, і гэта непакоіла Франуся. А мо Платон асцерагаецца?» (105); «Лажыцеся ўжо вы,— недавольным голасам падаў Платон,— найшлі час гэткую гутарку весці» (105); «Уцячы б з хаты? І хацелася, і баяўся... Не, лепш заставацца ў хаце» (106); «Старая Доўбніха намерылася выскачыць на двор, але гаспадар, хапіўшы яе за рукаў, супыніў.

— Куды ты, саматугам на ражон?! — вылаяўся ён.— Кладзіся лепш на зямлю ды моўчкі чакай канца.

Гэта рада падала знак усім: сталі хавацца хто куды. Франусь, не даючы сабе адчоту ад спалоху, кінуўся к падпечку, але нешта затрымаўся і падлез пад пол. Старэйшы брат схаваўся ў куце пад сталом; дзеці асталіся на печы» (106).

Фінал дэзерцірскай адысеі Франуся Доўбні трагічны: белапалякі, якія ўварваліся ў вёску, узялі яго пад канвой (думаючы, што ён бальшавік, бо быў у Чырвонай Арміі) і «павялі на расправу».

Сам аўтар твора не робіць ніякіх высн вывадаў з усяго расказанага ім, пакідае гэта свайму ўдумліваму чытачу. Такім чынам, апавяданне «Бегунец», напісанае ў час грамадзянскай вайны, прымушала задумацца над сэнсам тагачасных падзей, над учынкамі і паводзінамі асобных людзей, прымушала паглыбіцца ў аналіз навакольнага жыцця, асуджала тых, хто імкнуўся ўцячы ад рэчаіснасці, адасобіцца ад грамадскіх праблем.

Зварот да творчасці Ц. Гартнага ў жанры апавядання дае падставы гаварыць аб тым, што пісьменнік нейк абвострана адчуваў праблемы, якія хвалявалі і хвалююць удумлівых і неспакойных людзей на працягу многіх гадоў і якія змагаюцца за абуджэнне ў беларуса нацыянальнай свядомасці. Пазіцыя Ц. Гартнага, які асэнсоўваў гісторыю і перспектывы развіцця роднага краю, характарызуецца выключнай сумленнасцю, аб'ектыўнасцю і бескампраміснасцю.

У барацьбе, у бітвах гінуць не проста людзі рэальнага дня, але і карані будучых пакаленняў, якім бы ўзбагачаць і развіваць вынікі гэтай барацьбы. Але разбураная ў імперыялістычнай і грамадзянскай войнах бацькаўшчына будзе жыць; такія вывады можна зрабіць з апавяданняў «Сымонка-інжынер» (1921) і «На руінах» (1923).

У першым з іх — «Сымонка-інжынер» — прасочваецца лёс сялянскай сям'і ў час белапольскай акупацыі Беларусі; у большай ступені — перспектыўнасць дзесяцігадовага Сымона як актыўнага (калі б застаўся жыць) грамадзяніна новага жыцця. Ц. Гартны ўзняў праблему, якая і цяпер турбуе наша грамадства: страта лепшага нацыянальнага геннага фонду; з пазіцый свайго часу ён часткова адлюстраваў гэту з'яву ў некаторых сваіх творах.

Ва ўсёй сюжэтна-кампазіцыйнай структуры апавядання «На руінах» нязменна прысутнічае вобраз разбуранай бацькаўшчыны. Даючы карціны разбурэнняў на Беларусі як выніку імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў, аўтар, здавалася б, мог схіліцца да песімізму. Але трагічныя фарбы не перакрэсліваюць веру пісьменніка ў сілы народа, у тое, што беларусы змогуць зберагчы бацькаўшчыну. Толькі вера гэта не пазбаўлена суму, які гучаў у свой час у разважаннях Ф. Багушэвіча [4].

Герой апавядання яўрэй Шмуйла жыве ў Беларусі больш за трыццаць гадоў. За гэты час ён, надзелены назіральнасцю, змог разабрацца,

[4] Багушэвіч Ф. Творы. Мінск, 1967. С. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

што сабой уяўляе беларускі народ. Яго думкі пра беларусаў, факт адыходу на службу ў чырвонае войска старога Грэбеня, расказ Сымона Сука ў агульным кантэксце пра разбураную бацькаўшчыну гучаць верай у сілы народа, у лепшую яго долю. Ц. Гартны акцэнтуе ўвагу таксама і на тым, што моц народа — у яго адзінстве, узаемаразуменні і ўзаемадапамозе. Прыклад таму — сяброўства сем'яў Грэбняў і Сукоў. У апавяданні, думаецца, свядома не падкрэсліваецца ступень роднасці гэтых сем'яў (яны — родзічы), у чым нельга не бачыць своеасаблівы аўтарскі ідэал чалавечых адносін: усе мы родзічы, бо мы — людзі.

У апавяданні «Здарэнне з камісарамі» (1928) Ц. Гартны стварае вобразы кіраўнікоў-двурушнікаў Юстына і Лукаша. Пісьменнік не ў «крывым люстры адлюстроўвае» чалавека, як на гэта звяртаў увагу С. Александровіч[5], а з глыбокай праніклёнасцю ўзіраецца ў вобраз камісара з двайным тварам, двайной мараллю, двайным жыццём: адно — для ўласнага задавальнення, другое — шырма, за якой хаваецца бруд, нікчэмнасць гэтага чалавека. Ц. Гартны рашуча зрывае бутафорыю з сацыяльнага тыпа, апавяданне набывае характар выкрыцця, асуджэння падобных адказных асоб. Неабходна адзначыць, што такі падыход да вырашэння праблемы кіраўніка патрабаваў ад аўтара не толькі глыбокага грамадскага прадбачання, але і прынцыповай грамадзянскай пазіцыі.

Каб даць аб'ектыўную ацэнку твору, варта не толькі прымаць пад увагу рэальныя дзеянні персанажаў у «Здарэнні з камісарамі», але і ўсю сістэму мастацкіх прыёмаў і сродкаў, з дапамогай якіх створаны вобразы апавядання. Спалучэннем непасрэдных і апасродкаваных характарыстык у рэальным плане і рэтраспекцыі, кантрастаў паміж партрэтнымі дэталямі персанажа і яго дзеяннямі, паміж учынкамі герояў у розных умовах (спрыяльных ці неспрыяльных) ствараецца вобраз чалавека ў масцы.

Аўтар стварае не толькі негатыўны характар, падводзіць да разумення яго сутнасці, шкоднасці для грамадства, але і робіць своеасаблівы вывад: «Ні спрыт, ні сімпатыі не павінны мець месца ў справе нашага будаўніцтва... Трэба мераць па здольнасцях чалавека працаваць і па шчырасці яго працы... Кожны час вымагае сваіх здольнасцей. Зараз патрэбны будаўнікі, а не ахоўнікі дваццаць год таму нажытых вартасцей...»[6]

Трэба адзначыць, што гэты ідэйны вывад неабходна прынцыпова ўспрымаць у кантэксце апавядання, мець яго на ўвазе, ацэньваючы мастацкія вартасці і грамадскае значэнне твора.

Такім чынам, разглядаючы жанр апавядання ў творчасці Ц. Гартнага, можна гаварыць аб наступных тэндэнцыях у працэсе мастацкага адлюстравання рэчаіснасці 20-х гадоў: аб'ектыўнасць пры мастацкім асэнсаванні жыццёвага матэрыялу (пісьменнік не мог не гаварыць аб праблемах, што былі характэрнымі для таго часу); адлюстраванне жыццёвых з'яў не пазбаўлена суб'ектыўнасці, якая грунтуецца на асаблівай ступені абвостранасці ва ўспрыманні аўтарам рэчаіснасці, асабліва ўсяго, што звязана з нацыянальнымі і маральнымі пытаннямі; ідэйныя вывады ў Ц. Гартнага грунтуюцца на яго багатай жыццёвай практыцы ў спалучэнні з тымі партыйнымі задачамі, якія стаялі на парадку дня; асэнсоўваючы рэчаіснасць, пісьменнік апасродкавана звяртаецца да гістарычнага ў лёсе народа, мінулага жыцця персанажа, г. зн. разглядае з'явы, характары ва ўзаемасувязі, узаемазалежнасці; для апавяданняў Ц. Гартнага характэрны апасродкаваны спосаб адлюстравання: праз мастацкі вобраз, дэталь спачатку пастаноўка праблемы, затым мастацкае паглыбленне яе на прыкладзе дэталёвага факта, а ў выніку — цеснае перапляценне ідэйных вывадаў, якія ў кантэкс-

---

[5] Александровіч С. Слова-багацце. Мінск, 1981. С. 371.
[6] Гартны Ц. Здарэнне з камісарамі // Полымя. 1929. № 2. Кн. 2. С. 11.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

це ўсёй творчасці пісьменніка ў жанры апавядання набывалі характар сацыяльнага прадбачання.

*Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага*

## Резюме

Рассматриваются основные тенденции художественного отражения действительности в рассказах Т. Гартного 20-х годов. Анализируются произведения: «Щепки на волнах», «Красноармеец Панкел Липа», «Бегунец», «Сымонка-инженер», «На руинах», «Происшествие с комиссарами».

## Summary

The main trends of the artistic reflection of reality are considered in the stories of the 20s by T. Gartny. The works «Chips on the Waves», «Red Army Man Pankel Lipa», «The Fugitive», «Symonka the Engineer», «On the ruins», «The Incident with Commissars» are analyzed.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова